тага да паловы красавіка ажыццяўляе абагульненне вынікаў даследаванняў, а ў другой палове красавіка і ў маі падводзіць вынікі даследавання, ажыццяўляе іх апрабацыю на студэнцкай навуковай канферэнцыі і пасяджэнні кафедры, афармляе канчатковы варыянт дыпломнай работы.

Прапанаваная арганізацыя праходжання практыкі студэнтамі дазваляе:

— пастулова знаёміць студэнтаў з бібліятэкай, пераходзячы ад простых задач да больш складаных;

— праводзіць на кожным курсе па адной практыцы і такім чынам раўнамерна размяркоўваць вучэбную нагрузку студэнтаў па семестрах;

— праходзіць студэнтамі розных курсаў практыку ў розныя тэрміны;

— раўнамерна размяркоўваць аўдыторныя заняткі на факультэце па семестрах і стабілізаваць нагрузку выкладчыкаў;

— забяспечыць больш эфектыўны кантроль выкладчыкаў за ходам падрыхтоўкі студэнтамі дыпломных работ.

**Т.М. Мікуліч,**
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

## РОЛЯ ЭТНАГРАФІЧНАЙ ПРАКТЫКІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ"

Беларускі універсітэт культуры ўжо некалькі гадоў рыхтуе студэнтаў па спецыяльнасці "музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры". Студэнты дадзенай спецыяльнасці становяцца перш за ўсё супрацоўнікамі музеяў, а таму музейная практыка з'яўляецца для іх асноўнай. Акрамя музейнай, у план уведзена археалагічная практыка, што цалкам правамерна. Разам з тым значным недахопам вучэбнага плана з'яў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляецца адсутнасць этнаграфічнай практыкі для студэнтаў-музеязнаўцаў.

Этнаграфічная практыка заклікана дапамагчы студэнтам замацаваць веды, атрыманыя пры вывучэнні тэарэтычных курсаў "Народы свету", "Этналогія Беларусі", "Беларускі фальклор" і шэрага спецкурсаў па канкрэтных праблемах у межах названых дысцыплін, паглыбіць іх у асобных аспектах, на чым і будзе сканцэнтравана ўвага падчас правядзення палявых экспедыцый. Магчымасць рэальна ўдзельнічаць у авалоданні метадамі этналогіі, у зборы этнаграфічнага матэрыялу — гэта тое інтэрактыўнае навучанне студэнтаў, якое дапаможа падняць працэс засваення комплексу этналагічных дысцыплін на новы, больш высокі ўзровень.

Неабходнасць увядзення этнаграфічнай практыкі звязана з будучай працоўнай дзейнасцю студэнтаў, якія павінны ўмець не толькі працаваць з фондамі музеяў, але і папаўняць іх, у тым ліку ў час экспедыцыйнай работы. Значнасць курса "Этналогія Беларусі" для студэнтаў спецыяльнасці "музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры" не падлягае сумненню, і гэта было замацавана ўвядзеннем яго ў якасці аднаго з дзяржаўных экзаменаў. Такім чынам, ужо наспела неабходнасць праходжання этнаграфічнай практыкі студэнтамі названай спецыяльнасці.

Таксама ёсць усе падставы разгледзець пытанне ўвядзення этнаграфічнай практыкі для студэнтаў іншых спецыяльнасцей культуралагічнага профілю, якія вывучаюць тэарэтычны курс "Этналогія Беларусі". Традыцыйная культура — гэта тая база, на якой павінна грунтавацца сацыякультурная падрыхтоўка, а ўзровень яе засваення будзе відавочна вышэйшы пры замацаванні ведаў на практыцы.

Галоўнай мэтай этнаграфічнай практыкі з'яўляецца авалоданне студэнтамі асноўнымі метадамі збірання этнаграфічных матэрыялаў: візуальнае назіранне, апытанне насельніцтва, фіксацыя прадметаў матэрыяльнай культуры і з'яў духоўнай культуры, збор этнаграфічных калекцый і іх апрацоўка.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для паспяховага дасягнення пастаўленай мэты неабходна рэалізаваць наступныя задачы: 1) правесці практычныя заняткі па методыцы палявых этнаграфічных даследаванняў і спосабах фіксацыі сабранага матэрыялу; 2) правесці практычныя заняткі па методыцы камплектавання этнаграфічных калекцый і навуковай пашпартызацыі матэрыялаў музейных этнаграфічных фондаў; 3) кожнаму студэнту выканаць індывідуальныя заданні па зборы і апрацоўцы этнаграфічных матэрыялаў па адной з прапанаваных тэм.

Методыка палявых этнаграфічных даследаванняў уключае стацыянарны і экспедыцыйны метады збору этнаграфічных матэрыялаў. Абследаванне пасяленняў можа быць маршрутным і куставым, суцэльным і выбарачным. У залежнасці ад магчымасцей і пастаўленых мэт могуць быць выкарыстаны канкрэтныя метады правядзення палявых даследаванняў.

Матэрыяльнае забеспячэнне этнаграфічнай экспедыцыі, канешне, патрабуе пэўных фінансавых затрат, звязаных як з набыццём неабходных рэчаў (звычайна гэта сшыткі з цвёрдай вокладкай, "простыя" і каляровыя алоўкі, папера для малюнкаў, сантыметровыя ленты, лінейкі або трохвугольнікі), так і з транспартнымі расходамі. Сучасная этнаграфічная практыка не можа абысціся таксама без тэхнічных сродкаў (фотаапарат, дыктафон або магнітафон і інш.).

Увесь ход этнаграфічнай практыкі фіксуецца ў палявых дзённіках. Дзённікі ўключаюць: пісьмовую фіксацыю ўласных назіранняў, звесткі аб маршруце экспедыцыі, папярэднія вывады адносна прадмета даследавання.

Апытанне мясцовага насельніцтва — гэта адзін з галоўных метадаў збору этнаграфічнага матэрыялу. Студэнты павінны асвоіць пошук кампетэнтных інфарматараў, навучыцца падмацоўваць звесткі, атрыманыя ад аднаго інфарматара, расказамі іншых людзей. Папярэдне абавязкова складаецца план апытання. Уся атрыманая інфармацыя фіксуецца ў палявым сшытку. Палявы сшытак вядзецца па пэўных правi-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лах. Для запісу вуснай інфармацыі выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі (магнітафон, дыктафон і інш.).

Рэчавыя матэрыялы, якія выклікаюць цікавасць, фіксуюцца праз фотаздымкі, замалёўкі, чарцяжы. Абавязковым з'яўляецца атрыманне студэнтамі навыкаў апісання зафіксаваных матэрыялаў.

Збор этнаграфічных калекцый — важная частка этнаграфічнай работы. Складанне легенды рэчы, нумарацыя сабраных рэчаў, вылучэнне комплексу тыповых элементаў культуры, уласцівых насельніцтву пэўнай мясцовасці, вызначэнне аўтэнтычнасці (мясцовага паходжання) рэчаў неабходны для будучых супрацоўнікаў музеяў ужо як прафесійны навык.

Апісанні абрадаў таксама з'яўляюцца часткай этнаграфічнай работы, паколькі духоўная культура ёсць неад'емная частка этналогіі. Дадзеная работа прадугледжвае запіс паслядоўных дзеянняў, вызначэнне асобных этапаў абраду, фіксацыю абрадаў на плёнку (па магчымасці). Для збору матэрыялаў аб сучаснай культуры і побыту нярэдка выкарыстоўваецца метад анкетавання. Гэты сацыялагічны метад добра прыжыўся ў этналагічнай навуцы.

Работа з музейнымі этнаграфічнымі матэрыяламі можа разглядацца таксама як частка этнаграфічнай практыкі. Яна ўключае методыку камплектавання этнаграфічных фондавых калекцый, вывучэнне прынцыпаў камплектавання этнаграфічных фондаў і сістэмы адбору рэчаў музейна-экспазіцыйнай значнасці.

Практычныя навыкі навуковай дакументацыі музейных этнаграфічных фондаў звязаны з аваладаннем прынцыпамі стварэння фондавай дакументацыі этнаграфічных матэрыялаў, рэгістрацыі этнаграфічных матэрыялаў і іх пашпартызацыі.

Методыка зберажэння этнаграфічных матэрыялаў мае свае асаблівасці ў параўнанні з іншымі музейнымі і архіўнымі матэрыяламі. Адсюль паўстае неабходнасць практычнага аваладання рэжымам захоўвання калекцый, методыкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кансервацыі і рэстаўрацыі рэчаў у фондах, асаблівасцямі захоўвання этнаграфічных матэрыялаў.

Камплектаванне этнаграфічных экспазіцый прадугледжвае пэўныя правілы. Этнаграфічная практыка дапамагае студэнтам засвоіць асноўныя прынцыпы стварэння этнаграфічных экспазіцый, а таксама пабудовы экспазіцыйных комплексаў.

Падрыхтоўка і правядзенне экскурсіі па этнаграфічнай тэматыцы дазваляе студэнтам навучыцца метадам культурна-асветнай работы сярод насельніцтва. Выбар тэмы экскурсіі, падрыхтоўка да экскурсіі (знаёмства з экспанатамі і літаратурай), напісанне тэкста і правядзенне экскурсіі — вось той ланцужок, які павінен дапамагчы студэнтам авалодаць публічнай работай, звязанай з этнаграфічнымі матэрыяламі.

Выкарыстанне музейных этнаграфічных калекцый у краязнаўчай і навуковай працы — важная частка работы музейных супрацоўнікаў. Авалоданне ў час практыкі некаторымі метадамі навуковай апрацоўкі музейных этнаграфічных калекцый і папулярызацыі этнаграфічных матэрыялаў музеяў праз сродкі масавай інфармацыі вельмі дапаможа студэнтам у будучым.

Падсумоўваючы вышэйсказанае на карысць увядзення этнаграфічнай практыкі для студэнтаў спецыяльнасці "музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры", адзначым, што спецыфіка іх будучай работы прадугледжвае глыбокае веданне традыцыйнай культуры і гісторыі насельніцтва Беларусі, а дасягнуць такі ўзровень падрыхтоўкі шляхам толькі тэарэтычнага засваення немагчыма. Этнаграфічная практыка, якая ўжо некалькі гадоў праводзіцца са студэнтамі гістарычных факультэтаў БДУ, ГрДУ, дазваляе меркаваць пра яе эфектыўнасць пры падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ